

(1930 – 1984)

**Беларусь! Зялёная, залатая!**
**Край мой светлы, што выпіў мора пакут!**
**Да апошняй бярозы бласлаўляю**
**Светлы дзень, калі нарадзіўся тут.**

# Уладзімір Каратк

***Што мне да кінутых храмаў Мая,***
***Калі жывуць легенды ў народзе,***
***Калі на выспах глухіх адкрываю***
***Крокі мінуўшых тысячагоддзяў...***
***А я ў народ мой заўсёды веру,***
***І для яго, як вопытны кормшчык,***
***Адкрыю найлепшую ў свеце Амерыку***
***(Вёску Амерыку, што пад Оршай).***

***Уладзімір Караткевіч***

# Нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч 26 лістапада 1930г.

сям’і інтэлігента.



Бацькі.1916г. Орша

***Сямён Цімафеевіч Караткевіч*** – бацька Уладзіміра, паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду, які меў герб “Корвін”. Род пачынаўся ў першым пакаленні з Данілы, які ў 1546г. Стаў уладальнікам земляў у Раманаўшчыне і Лятаўшчыне Рэчыцкага павета. У 2-ой палове XIX ст. род збяднеў.

***Надзея Васільеўна Караткевіч*** (у дзявоцтве Грынкевіч), маці пісьменніка, паходзіла са старадаўняга шляхецкага роду. Рана засталася сіратой. У 1911 годзе закончыла Марыінскую гімназію ў Магілёве. Нарадзіла траіх дзяцей: Валерыя (1818), Наталлю (1922), Уладзіміра (1930).



*1913г. Сёстры Грынкевіч Яўгенія Васільеўна, Надзея Васільеўна (маці У. Караткевіча) і Ганна Сцяпанаўна*



***Васіль Юллянавіч Грынкевіч*** – дзед Уладзіміра Караткевіча. Нарадзіўся ў сям'і праваслаўнага святара. Быў цудоўным апавядальнікам. Значна паўплываў на светапогляд будучага пісьменніка. Дзедавы апавяданні пра Крычаўскае паўстанне 1743 – 1744 гг., пра вужыную каралеву, пра лебядзіны скіт, пра явар і каліну (мужа і жонку), пра звон, які патануў, пра горад на дне возера і іншыя сталі крыніцай для многіх твораў У. Караткевіча.

Пісьменнік згадваў, што праз дзеда ён палюбіў гісторыю і прыроду, што гэта быў чалавек "уладны, разумны і з'едлівы", які "валодаў нязменнай духоўнай і фізічнай сілай, бязмежнай энергіяй і азартам".

Васіль Грынкевіч стаў прататыпам Данілы Загорскага-Вежы ў рамане "Каласы пад сярпом тваім".


Заяц варыць піва



***Орша! Невялікі гарадок на беразе Дняпра. Зялёныя вуліцы, рэшткі валоў замчышча, гудкі далёкіх цягнікоў і блізкіх параходаў, дубовыя лясы па берагах Дняпра. Дзе б ні быў У. Караткевіч, Орша была з ім.***

*Ужо ў тры з паловаю гады Валодзя чытаў самастойна. “Пісаць (а спачатку “бубніць”) вершы пачаў год у шэсць, але, на шчасце, хутка кінуў гэты занятак. Трохі пазней спрабаваў пісаць апавяданні, прычым абавязкова іх ілюстраваў... Таленты выяўляў розныя : і маляваў, і ў музычную школу хадзіў (прычым абсалютны слых спалучаўся ўва мне з такой жа абсалютнай лянотай), але ўсе гэтыя таленты пайшлі тунна”.*



*1949г.*



*Валодзя Караткевіч.*
*1940г.*



*З сястрой Наталляй.*
*1937г.*

***У свае 14 гадоў Валодзя меў літаральна энцыклапедычныя веды па літаратуры і гісторыі. У гэты час, калі бібліятэкі былі амаль што пустыя (1945 год), вы маглі атрымаць усе неабходныя даведкі ў яго... З усіх школьных прадметаў У. Караткевіч найбольш любіў літаратуру і гісторыю. Гэтая любоў прадвызначыла далейшы лёс юнака.***





*1952г. Студэнт 3-яга курса Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Шаўчэнкі*



*1954г. Студэнт пятага курса.*



## *Маскоўскі перыяд жыцця і творчасці У.Караткевіча*
*(1958-1962гг.)*

- вучоба на Вышэйшых літаратурных курсах;
- вучоба на курсах сцэнарыстаў.

- ✔ *Вершы “Скарына пакідае радзіму”, “Вадарод”, “Дзяўчына пад дажджом”*
- ✔ *Цыкл вершаў, прысвечаных Н.Молевай, выкладчыцы гісторыі мастацтва*
- ✔ *Раман “Нельга забыць”(“Леаніды не вернуцца да Зямлі”)*
- ✔ *7 жніўня 1959 года(як сцвярджае У.Караткевіч) узнікла задума напісаць раман, прысвечаны паўстанню 1863-1864гг. Да рэалізацыі задуманага пісьменнік прыступіў у 1962годзе, вярнуўшыся з вучобы на радзіму.*





**Вялікі сын вялікага народа. Першаадкрывальнік многіх тэматычных пластоў у нашай нацыянальнай літаратуры. Выдатны мастак слова і не менш выдатны гісторык. Фатограф-прафесіянал. Непераўзыдзены жартаўнік, душа многіх і многіх кампаній, вечарынак, сябрын. Эрудыт, якіх**







***Помнік Уладзіміру Караткев***
***ў Оршы***

***Бог пайшоў. Жыццё ідзе пад кручу.***
***Але йдзі і не губляй спакой.***
***Ёсць замест прыватнай неўміручасці —***
***Бессмяротнасць нацыі тваёй.***




Адное засталося – сіла зброі.
Адное засталося – песні гневу.

***“...амаль у кожнага мастака ... мы знаходзім адзін цэнтр, зрэдку некалькі, але заўсёды няшмат, каля якіх групуюцца ўсе яго творы: гэтыя апошнія ўяўляюць сабой як бы спробы выказаць нейкую пакутлівую думку, і калі яна нарэшце выказваецца, з’яўляецца твор, сагрэты вышэйшай любоўю мастака, сэрца і думка якога імкнуцца да яго з нястрыманай сілай”.*** *(В.Розанаў, рускі вучоны)*



**У сям'і пісьменніка захавалася паданне пра Тамаша Грыневіча (сваяка з матчынага боку), які ўдзельнічаў у паўстанні 1863-1864 гадоў. Паўстанцы, якімі ён кіраваў, былі разбіты, а іх камандзіра расстралялі ў Рагачове па загадзе Мураўёва.**



*“Задума (напісаць раман “Каласы пад сярпом тваім) з’явілася яшчэ тады, калі я быў студэнтам Кіеўскага універсітэта. Замест таго каб хадзіць на лекцыі, - сядзеў у бібліятэцы над старымі кнігамі. Паступова перад маімі вачыма прываблівыя постаці маіх продкаў – мужных, свабодалюбівых людзей. І сярод іх – паўстанцы 1863 года, якія не шкадавалі жыцця, змагаючыся за “вашу і нашу свабоду”. А потым дзядзька паказаў мне на Дняпры мясціны, дзе адбываліся тыя падзеі. Руіны гаўптвахты, дзе расстрэльвалі людзей, і конскія могілкі, дзе іх потым закопвалі. Паступова ў мяне расло жаданне расказаць ад іх подзвігу, зберагчы памяць”.*

*З інтэрв’ю Уладзіміра Караткевіча вядомаму даследчыку беларускай літаратуры А.Мальдзісу ў 1967г.*





# Трэці нумар “Мужыцкай праўды”

N 3.

## MUŻYCKAJA PRAUDA.

Dziaciuki!

Żywuczy pad rądom maskouskim kożny wiedaje szto jon nas abdziraje i hłumić; no mało chto dobre padumau czy możno ad jeho spadziewaci sia czeho leń dla nas, albo dla dzieciej naszych. Ja Dziaciuki lepsz znajuczy ad was uzdumau napisaci piśmo [illegible] waszaho. Dla toho czytajcie z uwahaju, a jak pierečzytaje-cie dawajcie da druhoj wioski.

Czeławiek to takuju maje naturu, szto albo niczoho nie wiedaje i niczoho mieci nie chocze, albo kali dawiedajeć sia, to chocze zrazumieci dobre i dastaci usięko szto jemu należyć. Heto wielikaja prauda. Ot jeszcze nie dauno hawaryli naszyje, szto jeny stworeny dla toho, kab służyli pańszczynu i byli niewolnikami, a hawaryli dla toho szto niczoho niewiedali i niczoho mieci niechacieli, — a czy siehodnia hetak skażuć, kali uże wiedajuć mnoho i mnoho choczuć? Siehodnia usię uże parazumnieli, usie uże mużyki tałkujuć, szto Boh stworyu czeławieka kab jon karystawau z wolności [illegible] mahli inak dumaci. Heto prawo szto narod robić sia razumniejszym, wychodzić ad samoho Boha, a chto jemu schocze spraciulaci sia, taho albo sam Boh albo narod pa prykazu boskomu z ziemloju zmieszaje!

Wy Dziaciuki peunie wielmi ciekawyje skulże heto narod tak parazumnieu? Ja wam skażu skul heto.

Kali Prancuz pad Swistopolom zausim pabiu maskala, to dla toho kab maskal nie mieu siły i hroszy, prykazau narodowi daci wolność, niebraci rekrutou i wielikich padatkou. Maskal zhadziu sia na heto, bo dumau szto narod durny i patrapić jeho aszukaci. Jon to chacieu adno pieremienić niawolu, no baczu wielmi aszukau sia, bo chacia nam rąd maskouski niczoho u sześć let nie zrabiu, no my jak paczuli szto i mużyk może być wolny, tak paczali pytaci sia u ludziej razumniejszych i tałkawaci pamież saboju, aż zrazumieli szto to wolność znaczyć. Ot skul heto uziało sia szto narod parazumnieu. My siehodnia usie uże wiedajem, szto czeławiek wolny heto kali maje kusok swajej ziemli, za katoru ani czynszu i abroku nie płacić, ani pańszczyny nie służyć, — kali płacić małyje padatki i to nie na carskije stajni, siarni i kurwy, a na patrebu całaho narodu, kali nie idzie u rekruty czort wiedaje hdzie, a idzie baranici swaho kraju tahdy tolko, kali jaki nieprыjaciel nadyjdzie. — kali robić usięko szto sp[illegible] dabaje i szto nie kryudzić bliżniaho i chwały boskoj. — i kali wyznaje tuju wieru jakuju wyznawali jeho baćki, dziedy i pradziedy. Ot szto wolność znaczyć. Siehodnia to rąd maskouski nas nie atumanić, bo my ciepier nie takije durnyje jak byli upiered i paznali szto nam [illegible] manichwestou carskich a wolności patreba.

Maskal to chitry. jon to Dziaciuki chocze kab nie daci niczoho, a narod dumau szto uże maje usio jak należyć. Nie mieryuszy sudziecie chaciż z hetaho a jeho chitrości. Dwa roki uże tamu, kali jeszcze nijakich manichwestou a wolności nie abjaulali, narod u Piecierburhu, Maskwie i pa całoj Rassiei paczau wielmi kryczaci, szto kali rąd nie daść jemu wolności, to jon całaju hramadoju 19 Fewrala zbuntujeć sia, tahdy Car baczu zbajau sia i wieleu Senatawi zjechaci sia, a narodowi abjawić szto u Poście wolność dastanie. Narod durny pawierыu da i razyszou sia, a Car z Senatom patałkawauszy, jak minuła trewoha, tak i abjawiu u miejscu wolności manichwest, a u manichweście prykazywaje mużykam służyć da czasu pańszczynu pa staromu, a pa nowomu zapłacić bolsz hroszej u kaznu na pisarou, pasrednikou, da i czort ich wiedaje na szto. Sudzieciež ciepier sami czyż nie aszukiwajuć nas?

No nie na douho zdasce im krucielstwo, bo jak ja kazau my uże paznali szto nam nie manichwestou a wolności patreba — i to wolności nie takoj jakuju nam Car schocze daci, no jakuju my sami mużyki pamież saboju zrobimo. A dla toho Dziaciuki kab nichto was nie moh aszukaci, ciepier uże tałkujcie pamież saboju jakoj wam wolności patreba i jakim adno sposobom mużyk jeju dastać może. Tolko Dziaciuki śmieło, bo z nami Boh i prauda, a kali my z Bohom, to z nami wajawaci trudno bo boska moc wielika a narodu mnoho.

Tak z hetaho piśma ! widno szto niema czeho żdaci ad nikoho, bo toj tolko żnie chto pasieje. Tak siejcież Dziaciuki jak pryjdzie para pounoju rukoju -nie szkadujcie pracy - kab i mużyk byu czeławiekom wolnym, jak je na całuśkom świeci. Boh nam dapamoże!!

Jaśko haspadar z pad Wilni.

Kasztuje hros. 5.



Калінава

# *Кастусь Каліноўскі*

## *1838-1864*





Сімвал паўстання



*Пётра Сергіевіч*. "Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 г." (1955)

*П.Сергіевіч.* К.Каліноўскі і В. Урублеўскі сярод паўстанцаў. 1959г.





Параненыя паўстанцы каля Мінска. *1863 г.*

# Гістрыя ёсць настаўніца жыцця.

Старажытныя рымляне



*Парадкі Мураўёва*
*Канец XIX ст.*

Студзень 1959г. Мінск. М.С.Хрушчоў: ***“ ...чым хутчэй усе будзем гаварыць па-руску, тым хутчэй пабудуем камунізм”.***

- Звужаецца сфера ўжывання беларускай мовы;
- выкладанне ў школах, асабліва гарадскіх, пераводзіцца на рускую мову;
- змяншаецца колькасць беларускамоўных кніг і газет;
- любыя адхіленні ад афіцыйна вызначаных пастаноў ў мастацкіх творах, у кіно і тэатры падлягалі разбору ў партыйных органах і асуджэнню.



А.Салжаніцын, звяртаючыся да інтэлігенцыі, да моладзі, да ўсіх суайчыннікаў незадоўга да арышту і высылкі з краіны: ***“Мы так безнадзейна расчалавечыліся, што за сённяшнюю сціплую кармушку аддадзім усе прынцыпы, душу сваю, усе намаганні нашых продкаў, усе магчымасці для нашчадкаў – толькі б не парушыць свайго лядашчага існавання. Не засталося ў нас ні цвёрдасці, ні годнасці, ні сардэчнага жару...” (“К чему стадам дары свободы?” А.С.Пушкін)***

***“Вялікую і святую справу трэба рабіць з адкрытым забралам”.***



1965г. – 1-ая публікацыя рамана на старонках часопіса “Полымя”. Супраць станоўчай рэцэнзіі А.Мальдзіса – разгромны артыкул крытыка Я.Герцовіча.
Асобнай кнігай “Каласы...” выйшлі толькі праз тры гады, хоць афіцыйна не былі забаронены.

“Пастараўся заплаціць гэтай кнігай доўг Дняпру, людзям паўстання *1863* года, Беларусі ”.

У.Караткевіч

